грамотно её осуществлять, заботясь об экономии материала. Часто учитель предоставляет учащимся возможность самим найти рациональные способы разметки деталей. Выполняя технологическую операцию резания, необходимо оставлять как можно меньше обрезков материала или такие, которые можно было бы использовать при изготовлении других изделий.

Существенным звеном в экономическом воспитании учащихся является решение технологических и технических задач на уроке, как расширение параметров использования инструментов и приспособлений. Это позволяет улучшить качество изделия, совершенствовать приемы работы, экономить материалы, время, усилия ученика.

Заключение. Таким образом, экономическое воспитание учащихся на уроках по технологии обработки материалов осуществляется в процессе приобретения опыта трудовой деятельности через организацию труда детей, обучение умению планировать свой труд, владению инструментами, выполнение технологических операций, решение технологических задач, бережное отношение к инструментам, материалам, трудовым усилиям, времени, усвоение теоретического материала.

Список литературы

1. Учебные программы для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения 1-4 классы. Минск. Нац. институт образования. 2012г, с 153
2. Кушин. М.А., Шимолин. В.И. Экономия без секретов: кн. для учащихся. – Мн.: Нар. асвета, 1989г, с. 22.

ВЫХАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ Ў ВУЧНЯЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ

Т.А. Суднічэнка
Орша, Аршанскі каледж ВДУ імя П.М.Машэрава

Вопытныя настаўнікі пачатковых класаў вялікае значэнне надаюць выхаванню ў вучняў нацыянальнай самасвядомасці, пры гэтым прымаюць меры па далучэнні бацькоў ў выхаваўчую работу на ўроках, таму што важна садзейнічаць умацаванню і пашырэнню ўплыву на паводзіны вучняў бацькоў, паважаных людзей, герояў мінулых падзей. Моц уздзеяння зместу, сродкаў, форм і метадаў таксама і народнай педагогікі можна растлумачыць блізкасцю яе да нацыянальных каранёў, больш глыбокім пранікненнем у нацыянальную самасвядомасць. Дасягненні народнай педагогікі займаюць важнае месца ў выхаванні вучняў пачатковых класаў, таму што абуджаюць цікавасць да свайго роду,сям'і, выхоўваюць пачуццё гонару за працоныя, творчыя справы старэйшых пакаленняў, фарміруюць пачуццё павагі і любові да Радзімы

Мэтай дадзенай работы з'яўляецца аналіз матэрыялаў, які аказвае вельмі важны ўплыў на фарміраванне кругагляду і светапогляду падрастаючага пакалення, на выхаванне нацыянальнай самасвядомасці.

Матэрыял і метады. Аналіз навуковай літаратуры, абагульненне, параўнальна-супастаўляльны аналіз.

Маральныя асновы нацыянальнай самасвядомасці, беларускай народнай педагогікі маюць агульначалавечае значэнне. У іх канкрэтызуецца аптымізм народа, які прайшоў нялёгкі шлях выпрабаванняў, глыбокая павага да іншых

Репозиторий ВГУ

народаў, талерантнасць, мужнасць і адвага. Сёння назіраецца асабліва інтэнсіўны працэс развіцця нацыянальнай педагагічнай думкі, таму што ідзе працэс узбагачэння традыцый, узнікнення новых падыходаў да выхавання маладога пакалення. Народная педагогіка ўсё ў большай ступені праяўляе сябе як агульначалавечая з'ява. Менавіта ў народнай педагогіцы адлюстроўваецца пераемнасць пакаленняў, яна з'яўляецца крыніцай нацыянальнай самасвядомасці, светаразумення, творчасці. Вялікую ролю пры гэтым адыгрывае фальклор. Выконваючы функцыю аднаго з элементаў любой нацыянальнай культуры, фальклор з'яўляецца дзейсным сродкам самавыяўлення народа: праяўляюцца лепшыя рысы нацыі, ідэалы высокай маральнасці. Фальклор беларускага народа адлюстроўвае вопыт выхавання маладога пакалення, сістэму прыёмаў і метадаў выхавання.

Вынікі і іх абмеркаванне. Працэс станаўлення асобы, яе маральнага развіцця адбываецца на працягу ўсяго жыцця, але асновы закладваюцца ў дзіцячым узросце. З першых дзён жыцця дзіця чуе матчыны калыханкі, падрастаючы, захапляецца мужнымі казачнымі волатамі-абаронцамі, песнямі. Дзяцінства, малодшы школьны ўзрост – найбольш спрыяльны перыяд для авалодання асобнымі каштоўнасцямі нацыянальнай культуры. Менавіта ў гэты перыяд даступнымі і цікавымі для ўспрыняцця вучняў з'яўляюцца казкі, легенды, паданні, загадкі, прыказкі, прымаўкі. Усе гэтыя жанры народнай паэтычнай творчасці выконваюць, перш за ўсё, важную маральна-выхаваўчую функцыю.Перадача духоўнай спадчыны адбываецца праз веды, вопыт, мудрасць у працэсе канкрэтнай дзейнасці: ад бацькі – сыну, ад маці – да дачкі. Гэта і ёсць народная педагогіка ў дзеянні, знаёмства з майстэрствам народнага выхавання. Сіла народнай педагогікі закладзена ў аўтарытэтных думках і плённых выніках дзейнасці блізкіх і дарагіх людзей [2, 9].

Першаасновай народнай педагогікі з'яўляецца культ працы і чалавечаго розуму, умелых рук і разумення свайго месца ў прыродзе. Пра гэта ўсё вядзецца размова пры вывучэнні фальклорных твораў на ўроках літаратурнага чытання ў пачатковай школе: раздзел "Што ў народзе скажуць, як у вузел звяжуць" (2 клас"Беларусачка"), "З крыніц народных" (3 клас "Літаратурнае чытанне"), "З рога ўсяго многа" (4 клас "Літаратурнае чытанне"). Адной з галоўных задач, якую павінны данесці настаўнікі вучням пры вывучэнні твораў у гэты перыя, з'яўляецца задача выхавання працавітасці, добрасумленнасці, адказнасці за даручаную справу. Чалавечая годнасць ацэньваецца так: "Працаваць не любіш – чалавекам не будзеш".

Рознымі відамі працоўнай дзейнасці чалавек абавязаны з'яўленню і развіццю мовы. Родная мова – адзін з першых настаўнікаў дзіцяці і важны сродак выхавання народа, таму што гэта тое, з чым жыве чалавек, з дапамогай роднай мовы чалавек далучаецца да сваіх продкаў і нашчадкаў, родная мова робіць чалавека прыналежным да бясконцага ланцуга пакаленняў. У народзе заўсёды паважалі продкаў, ведалі свой радавод, традыцыі сям'і. Без ведання гісторыі свайго роду цяжка зразумець сэнс паняцця "Радзіма". Вопыт народнага выхавання сведчыць аб тым, што любоў да Радзімы зараджаецца з маленства і пачынаецца з любові да бацькоў, да роднай мовы, культуры, гісторыі. ("Усюды добра, а дома лепей", "Хто мову і веру мяняў, не толькі сябе, а і маці прадаваў").

У народнай педагогіцы значнае месца займае і пытане эстэтычнага выхавання. Імкненне да прыгажосці ўласціва кожнаму чалавеку: жыллё, мэбля, прылады працы адзенне і прадметы побыту характарызуюцца пардуманасцю, зручнасцю ў карыстанні, прыгажосцю. Імкненне народа жыць па законах

Рэпозиторий ВГУ

прыгажосці, стварацъ яе знайшло адлюстраванне ў выказваннях: “Не глядзі, што на галаве, а глядзі, што ў галаве”, “Па адзенню сустракаюць, а па розуму выпраўляюць”.

Многія народныя выказванні разглядаюць здароўе як найвялікшае багацце, якое “на кірмашы не купіш”. Народныя прыёмы і метады фізічнага выхавання выкарыстоўваюцца настаўнікамі з улікам узроставых і індывідуальных асаблівасцей вучняў: гульні, спаборніцтвы, якія імітавалі працоўны працэс або паляванне, ваенныя дзеянні, абрады, іспыты на фізічную вынослівасць.

Адметнай рысай выхавання ў народнай педагогіцы было прывіццё беражлівых адносін да прыроды. Дзіця вучылі назіраць за звярамі, птушкамі, рыбамі, іх здольнасцямі мяняць паводзіны ў адпаведнасці са зменамі надвор’я. Здаўна заўважылі людзі, што “ластаўка да зямлі – быць дажджу”, “мурашы спяшаюцца да муравейніка – а дождж”. Праверaныя шматгадовай практыкай прыкметы ўздзейнічалі на разумовае выхаванне дзяцей, вучылі іх асэнсоўваць з’явы прыроды, заўважаць іх цыклічнасць, кругаварот, што развівала назіральнасць і любоў да прыроды.

Важным напрамкам у беларускай народнай педагогіцы з’яўлялася маральнае выхаванне. У народзе здаўна шанаваліся прыстойныя, прыкладныя паводзіны. Народ імкнуўся, каб выхаванне, вучоба, зносіны фарміравалі ў моладзі пачуццё дабрыні: “Добрая справа без узнагароды не застанецца”, “Дабро рабіць – сябе весяліць”. Праўдзівасць і чэснасць – аснова народнага ідэалу выхаванасці. Ён выказаны ў прымаўцы “На праўдзе свет стаіць”. Выхоўваючы ў вучняў гэтыя якасці, настаўнік вучыць: “Хто раз схлусіў, таму ніколі веры няма”, “Ад хлусні не мруць, толькі веры больш не даюць”. Пытанні сяброўства і дружбы таксама знайшлі шырокае адлюстраванне ў народнай педагогіцы і на старонках падручнікаў для вучняў пачатковай школы: “Не той друг, хто мёдам мажа, а той, хто праўду ў вочы скажа”, “Сам згінь, а сябра з бяды вызвалі”, “Стары друг лепш за новых двух”. У гэтых выказваннях розныя адценні: і прынцыпы выбару сябра, і пытанні вернасці ў сяброўстве, і ацэнка сапраўдных таварышаў. Высока ацэньваючы станоўчыя якасці чалавека, народ у свіх выказваннях рэзка асуджае амаральнасць, дрэнныя ўчынкі: “Чыста ходзіць, ды нячыста жыве”. Важнай ідэяй вуснай народнай педагогікі з’яўляецца думка аб тым, што выхаванне і навучанне павінна працягвацца бесперапынна: “Век жыві, век вучыся”, “вучыцца ніколі не позна”.

Заключэнне. Важнае значэнне для выхавання нацыянальнай самасвядомасці маладога пакалення мае народная педагогіка, якая складваецца на аснове калектыўнай творчасці многіх пакаленняў і забяспечвае перадачу гістарычнага і сацыяльнага вопыту. Зварот да народнай педагогікі з’яўляецца і фактарам, які стымулюе авалоданне роднай мовай, узнаўленне народных традыцый, узбагачэнне культуры, дазваляе выкарыстоўваць у працэсе выхавання высокамаральныя сродкі і змест. Выхаванне, заснаванае на народнай мудрасці, валодае той сілай, якой няма роўных у лепшых тэарэтычных галінах навукі і культуры.

Спіс літаратуры

1. Арлова, Г.Н. Беларуская народная педагогіка.– Мн.:Нар асвета,1993. – 20 с.
2. Беларускі дзіцячы фальклор. – Мн.: Беларусь, 1994.– 271 с.
3. Віслабокава, Н.С. Выхаванне цікавасці да вывучэння роднай мовы // Беларуская мова і літаратура.- 2004.- №5.- С.3.

Репозиторий ВГУ